УДК 94(476)«19»:338.1

# АСАБЛІВАСЦІ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ РАМЕСНЫХ ЦЭХАЎ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У КАНТЭКСЦЕ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ ТРАНСФАРМАЦЫЙ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТ.

*Лянцэвіч В. М.*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт
Мінск, Беларусь

***Анатацыя.*** *У артыкуле аналізуецца трансфармацыя рамесных цэхаў на беларускіх землях у першай палове XIX ст. у кантэксце развіцця таварна-грашовых адносін і зараджэння капіталізму. Асвятляецца дзейнасць рамеснага таварыства Мінска паводле статута 1852 г., адзначаюцца змены ў арганізацыі працы, правы рамеснікаў, рост няцэхавай вытворчасці і занапад цэхавай сістэмы. Праз статыстыку і архіўныя дакументы паказваецца канкурэнцыя паміж цэхавымі і няцэхавымі рамеснікамі, а таксама неэфектыўнасць спроб уладаў захаваць цэхавы кантроль. Выкладаецца шырокая панарама сацыяльна-эканамічных змен у гарадской вытворчасці сярэдзіны XIX ст.*

***Ключавыя словы:*** *рамесныя цэхі; таварна-грашовыя адносіны; цэхавая сістэма; няцэхавая вытворчасць; капіталізм; Мінск.*

# THE PECULIARITIES OF THE FUNCTIONING OF CRAFT WORKSHOPS IN THE BELARUSIAN LANDS IN THE CONTEXT OF SOCIO-ECONOMIC TRANSFORMATIONS OF THE FIRST HALF OF THE 19TH CENTURY

*Lentsevich O. M.*
Belarusian State University of Economics
Minsk, Belarus

***Annotation.*** *The article analyzes the transformation of craft guilds in the Belarusian territories during the first half of the 19th century in the context of the development of commodity-money relations and the emergence of capitalism. It examines the activities of the Minsk craft society according to the 1852 statute, highlighting changes in labor organization, the rights of artisans, the growth of non-guild production, and the decline of the guild system. Using statistical data and archival documents, it demonstrates the competition between guild and non-guild craftsmen, as well as the inefficiency of governmental efforts to maintain guild control. The article presents a broad panorama of socio-economic changes in urban production in the mid-19th century.*

***Keywords:*** *craft guilds; commodity-money relations; guild system; non-guild production; capitalism; Minsk.*

Рамесныя цэхі з'яўляліся сярэднявечнай формай арганізацыі гарадской вытворчасці і былі вядомы на беларускіх землях з XV–XVI стст. Гэта былі прафесійныя арганізацыі, якія ствараліся з мэтай абароны эканамічных інтарэсаў, характарызаваліся строгай рэгламентацыяй, замкнёнасцю і сацыяльнай закрытасцю. Спецыялізаваныя цэхі складаліся з майстроў адной спецыяльнасці і аднаго веравызнання.

Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі (канец XVIII ст.) цэхі захоўваліся як легальная форма рамеснай дзейнасці. Аднак калі на змену натуральнай гаспадарцы прыходзіла таварна-грашовая і прамысловая, цэхі ўжо не адпавядалі новым патрэбам эканомікі. Таму па сваім характары рамесныя цэхі XIX ст. істотна адрозніваліся ад сярэднявечных цэхаў. Пад уплывам таварна-грашовых адносін, якія пранікалі ў гарадскую прамысловасць і рамесную вытворчасць, у цэхавую сістэму былі ўнесены пэўныя змены. Напрыклад, майстар атрымліваў права мець колькі заўгодна вучняў і чаляднікаў (падмайстроў), былі ліквідаваны абмежаванні ў галіне вытворчасці і збыту рамесных вырабаў і г. д.

Урадавымі ўстановамі здзяйсняліся некаторыя спробы рэарганізацыі цэхавай сістэмы з мэтай пашырэння свабоднай рамеснай дзейнасці як членаў цэха, так і асоб, якія не ўваходзілі ў цэх. Адной з падобных спроб быў Статут мінскага рамеснага таварыства 1852 г. [1, с. 377–380], дзе былі адлюстраваны новыя з'явы, выкліканыя зараджэннем капіталістычных адносін у рамеснай вытворчасці. Па новым статуце ў Мінску засноўвалася рамеснае таварыства, асноўнай мэтай якога было «усовершенствование ремесел посредством взаимного совещания и действий его членов». Раз у чатыры месяцы збіраўся сход рамеснікаў, на якім вырашаліся ўсе пытанні, звязаныя з арганізацыяй рамеснай вытворчасці. Заахвочваліся спецыялізацыя рамяства, а таксама «опыты и изобретения, сделанные кем-либо из членов».

Рамеснікі, якія ўваходзілі ў цэх, па-ранейшаму падзяляліся на майстроў, чаляднікаў і вучняў. Агульнае кіраванне цэхамі ажыццяўляў рамесны галава, які падпарадкоўваўся гарадскому магістрату і даваў справаздачу перад гарадской думай. Ён займаўся пытаннямі запісу ў цэх і выключэннем з яго, назіраў за парадкам плацяжу падаткаў і выкананнем іншых павіннасцей з боку рамеснікаў.

Згодна з новым статутам, цэх не меў права забараніць няцэхавым рамеснікам займацца тым ці іншым рамяством з мэтай пражытку. Сябры цэха маглі наймацца на фабрыкі і заводы. Майстар меў права трымаць майстэрню з неабмежаванай колькасцю наёмных работнікаў. Свае

вырабы ён мог прадаваць, «но не в другом месте, как в жилище своем или на площади, а не нарочно заведенных ...», г. зн. у крамах.

Важным пунктам правілаў стала адмена пры ўступленні ў цэх нацыянальных і рэлігійных абмежаванняў. У статуце таксама ўказваецца, што цану на рамесныя вырабы мог устанаўліваць толькі сам рамеснік, а не рамесны сход і цэхавая ўправа. Гэта спрыяла пашырэнню асабістых правоў рамеснікаў пры збыце сваіх вырабаў.

Манапольнае становішча цэхаў на рынку ліквідавалася. Згодна з прынятымі правіламі, «мостовщики, землекопы, каменщики, каменотесцы, плотники и штукатуры, также нанимающиеся в услужение люди», г. зн. падзёншчыкі, работнікі фабрык і заводаў, чорнарабочыя, рамізнікі і інш., вызваляліся ад запісу ў цэх. Такім чынам, Статут мінскага рамеснага таварыства 1852 г. замацаваў новыя прынцыпы рамеснай дзейнасці, у тым ліку спецыялізацыю рамяства, падтрымку тэхнічных інавацый і пашырэнне свабоды працы.

Рост колькасці рамеснікаў, развіццё асобных рамесных спецыяльнасцей садзейнічалі павелічэнню колькасці цэхаў. Так, у Мінску колькасць цэхаў у пачатку 50-х гг. XIX ст. дасягала 24. У канцы 50-х гг. у Слуцку і Віцебску было па 25 цэхаў. Такая ж колькасць цэхаў налічвалася ў Магілёве і іншых буйных беларускіх гарадах. Аднак колькасць была непастаяннай і не магла сведчыць аб умацаванні або паслабленні цэхавай сістэмы. Апошняе тлумачыцца тым, што часам асобныя цэхі ствараліся з рамеснікаў, якія раней уваходзілі ў неспецыялізаваныя цэхі, што аб'ядноўвалі рамеснікаў некалькіх спецыяльнасцей. Напрыклад, у другой чвэрці XIX ст. у Мінску шляхам падзелу ўтварыліся кравецкі, шмухлерскі, кавальскі, бляхарскі, медніцкі і іншыя цэхі [2, л. 18]. Згодна з Статутам 1852 г., рамесныя спецыяльнасці аб'ядноўваліся ў наступныя цэхі: «1. портные, ватники, кушнеры – в цех мужских уборов; 2. сапожники; 3. цех мебельный – фортепьянщики, столяры, токари; 4. кузнечный – кузнецы, слесари; 5. часовых мастеров; 6. медных дел – бляхари, резчики, бронзовщики и котляры; 7. золотых и серебряных дел цех; 8. кожевники; 9. цех мужских и женских уборов – перчаточники и модистки; 10. цех шмуклерских изделий – писачи, красильщики; 11. стекольницкий цех – стекольщики, гребенщики, цинковники; 12. экипажный цех – шорники, стельмахи; 13. цех переплетчиков; 14. сидельческий цех – первоклассные купеческие приказчики и слуги, занимающиеся у купцов по лавкам торговлею» [2, л. 19].

Калі ў пачатку 1853 г. у Мінску налічвалася 24 цэхі, то да канца гэтага года, паводле пастаноў гарадской думы, іх засталося толькі 14

[2, л. 19; 3]. Ужо праз год са складу цэха мужчынскіх убораў вылучаюцца самастойныя цэхі: кравецкі, кушнерскі, ватніцкі і інш. [4].

У малых гарадах, дзе была невялікая колькасць рамеснікаў адной спецыяльнасці, паводле рамесных пастаноў, у цэхі аб'ядноўваліся рамеснікі некалькіх, часам нават нyроднасных спецыяльнасцей. Перавага ў такіх гарадах аб'яднаных цэхаў сведчыць аб тым, што тут рамёствы былі прадстаўлены невялікай колькасцю рамеснікаў. Ліквідацыя таго ці іншага цэха ішла не за кошт знікнення прадстаўленага ў ім рамяства, а з прычыны аб'яднання ў адным цэху вялікай колькасці рамесных прафесій. Вышэйсказанае і тлумачыць той факт, што ў розныя перыяды колькасць цэхаў у гарадах была неаднолькавай.

Аб працэсе змены цэхавага рамяства ў 50-я гг. XIX ст. у Мінску дае прадстаўленне табліца 1 [4; 5].

*Табліца 1*

**Працэс змены цэхавага рамяства ў 50-я гг. XIX ст.**

| Назва цэха | Колькасць рамеснікаў у цэху | | | |
|---|---|---|---|---|
| | **1854 г.** | **1855 г.** | **1856 г.** | **1857 г.** |
| Кравецкі | 372 | 200 | 179 | 189 |
| Шавецкі | 185 | 150 | 97 | 83 |
| Кушнерскі | 103 | 100 | 61 | 56 |
| Кавальскі | 40 | 30 | 18 | 17 |
| Гадзіншчыкаў | 24 | 22 | 20 | 11 |
| Меднажасцяны | 39 | 42 | 31 | 19 |
| Золатасярэбраны | 75 | 45 | 40 | 33 |
| Гарбарны | 21 | 22 | 11 | 11 |
| Пальчаткавы | 21 | 30 | 20 | 4 |
| Шмуклерскі | 36 | 30 | 14 | 14 |
| Экінажны | 50 | 50 | 25 | 25 |
| Пераплётчыцкі | 25 | 25 | 13 | 13 |
| Мэблявы | 78 | 60 | 39 | 37 |
| Мясны | 100 | 60 | 50 | 50 |
| Гаршчэчны | 71 | 70 | 25 | 25 |
| Шкляны | 38 | 28 | 18 | 15 |
| Камінараў | 13 | 15 | 12 | 6 |
| Булачны | | | 60 | 50 |
| **Усяго** | **1291** | **979** | **733** | **658** |

Характэрнай рысай у развіцці рамеснай вытворчасці Мінска ў 50-я гг. з'яўляецца памяншэнне колькасці цэхавых рамеснікаў. Калі ў 1854 г.

у 17 цэхах налічвалася 1292 рамеснікі, то ў гэтых жа цэхах у 1855 г. іх засталося 979. У 1856 г., нягледзячы на павелічэнне колькасці цэхаў да 18. колькасць рамеснікаў паменшылася да 733, а ў 1857 г. – да 658. Такім чынам, рост колькасці цэхаў не можа сведчыць аб росце цэхавых рамеснікаў. Памяншэнне колькасці апошніх звязана з тым, што новыя вытворчыя адносіны разбуралі старыя асновы цэхавай арганізацыі. За кошт цэхавых рамеснікаў хутка расла колькасць няцэхавых.

Аналагічныя працэсы назіраліся і ў некаторых іншых гарадах. Напрыклад, у 1825 г. у Віцебску было 1645 цэхавых [6], у 1849 г. – 1661 і 1768 няцэхавых [7], а ў 1861 г. – 243 [8]. Памяншэнне цэхавых бачна і ў Магілёве. Тут у 1837 г. іх было 1622 чалавекі [9, с. 416], а ў 1844 г. – 752 [10].

Цэхавая арганізацыя перашкаджала далейшаму росту рамеснай вытворчасці. Таму многія рамеснікі, якія не ўваходзілі ў цэхавую арганізацыю, паспяхова канкурыравалі з цэхавымі, пра што сведчаць шматлікія архіўныя дакументы. Напрыклад, у 1853 г. старшына гродзенскага мясніцкага цэха даносіў гродзенскаму магістрату, а апошні – у губернскае праўленне, што «…в здешнем городе значительное количество разных лиц, не записанных в мясницкий цех… занимаются продажею в разброд свиного мяса и сала, отчего предметы эти дошли до весьма высоких цен, ибо они, покупая на базаре свиней, платят за них большие деньги и перепродают. Это приводит к тому, что лица, записанные в мясницкий цех, ничего не могут продать и очень беднеют и не могут нести повинности и, наконец, лишены всех средств к пропитанию себя и своих семейств. Посему просим распоряжения магистрата о воспрещении незаписанным в цех лицам заниматься перекупом и продажею свиного сала и мяса, за исключением лиц, привозящих таковые на базар в торговые дни из окрестных мест, последствие чего предметы эти будут продаваться гораздо дешевле... а цеховые лица поправят свое положение и будут нести лучше государственные повинности» [11, л. 1]. Аднак губернскае праўленне адхіліла просьбу магістрата і цэхавых старшын [11, л. 3].

Старшына менскага свячнога цэха Ліхтэрман таксама даносіў у менскую гарадскую думу аб тым, што мешчанін Чарток «удерживает фабрику не будучи цеховым мастером, имеет двух учеников и состоит его амбар на нижнем базаре, где находится приказчик нецеховой без дозволения цеха, а равно проживающий в городе Ранет имеет на том же базаре лавку и амбар и в Комаровке фабрику; в цеху не записан и кварталовых до трех уже лет не уплатил» [12, л. 22].

Мінскі зарэмбіцкі цэх у 1843 г. скардзіўся на тое, што салдаты і іншыя асобы (у ліку 17 чалавек) уладкавалі свае куфары там, дзе знаходзяцца іх рухомыя лавачкі. Цэх просіць забараніць гандляваць тым, хто самавольна гандлюе без платы ўнёску ў гарадскі даход [13].

У 1854 г. старшыня менскага экіпажнага цэха даносіў, што ніжэйшыя вайсковыя чыны «постоянно делают подрыв действительным мастерам г. Минска, производя на заказ работы на посторонних людей и наносят вред ремесленникам города, которые лишаются пропитания и не могут нести государственных повинностей» [14]. Кавальска-слясарны цэх указваў на тое, што салдаты падрывалі дзейнасць кавальска-слясарнага цэха. Аднак менскае губернскае кіраванне паведамляла, што салдаты і іншыя асобы «могут продавать произведения своего ремесла, с тем только, чтобы не имели для его особых помещений» [12, л. 18].

Аналагічныя скаргі паступалі і ад іншых цэхаў. У 1846 г. на зборы менскага рымарскага цэха адзначалася, што «умножилось мастерей рымарского рукоделия со стороны евреев, которые ныне вовсе цеху сему неизвестны и никаких цеховых повинностей не отбывают» [15, л. 2].

У 1854 г. менскі рамесны галава ў данясенні гарадской думе паведамляў, што шматлікія рамеснікі пры пераходзе ў майстры не праходзілі выпрабавальнай працы, не былі «записаны в книги мастеров, подмастеров и учеников, потому нашлось очень много ремесленников-евреев без известия цехам, кои, не желая переходить законом предназначенные ремесленные степени, вдруг самовольно наименовались мастерами и в настоящее время так ведется, что всяк из евреев, хотя дело свое слабо знает, вдруг называется мастером, берет работу и принимает учеников, эти ученики иногда, бросая науку, сами называют себя мастерами и сами уже себе принимают учеников. Так постепенно распространяется беспорядок, ибо каждый смотрит друг на друга. И так ремесленники сейчас вышли из границ всякого повиновения и порядка. Производящих в городе ремесла есть около 1000 человек, но хороших очень мало.

Прошу думу разрешить следующее: посредством полиции объявить всем по городу занимающимся ремеслом как мастерам цеховым, так и другим несмотря на то, записан он в цех или нет, чтобы в течение двух месяцев непременно явились в управу для записи к которому-либо существующему цеху и чтобы представили в оную собственноручную пробную работу, по рассмотрении и обсуждении коей соответственно степени их знания разделить на разряды таким образом:

1. Если работа отличная – оставить мастером и может иметь капитал в товаре на 100 руб. серебром. Их зачислить в первый разряд.

2. Ежели пробная работа будет посредственна, представивший не будет в состоянии, открыв мастерскую, иметь в товаре на 100 руб. серебром, но в состоянии обзавестись хорошим инструментом, удерживать по крайней мере одного ученика – ко второму разряду.

3. Таких, которые представят работу простую или крестьянскую и не будут в состояния иметь 100 руб. в товаре, но та работа будет посредственна – в третий разряд» [16, л. 15–17].

Рамеснікі ўсіх спецыяльнасцей імкнуліся абыйсці цэхавыя правілы і завесці сваё рамеснае прадпрымальніцтва па-за рамкамі цэхавай арганізацыі. Нягледзячы на шматлікія скаргі з боку цэхаў аб забароне няцэхавым майстрам займацца рамяством, гарадскія думы, мясцовыя магістраты і губернскія праўленні не ў стане былі забараніць гэта, бо з кожным годам лік няцэхавых майстроў павялічваўся.

Адным з паказчыкаў заняпаду цэхавай сістэмы з'яўляецца стаўленне да яе саміх чальцоў цэха. Калі раней у цэхах была моцная дысцыпліна, то з разлажэннем цэхавай сістэмы яна ўпала. Напрыклад, цэхавыя старшыны Мінска даносілі ў гарадскую думу, што майстры, чаляднікі і вучні зусім перасталі ім падпарадкоўвацца «и просят думу за ослушание и недисциплинированность наказать их» [16, л. 13]. У 1846 г. мінскі рымарскі цэх пастанавіў: «За нарушение правил и беспорядок в отношении к ремеслу и дисциплине без спора вносить в пользу цеховой кассы по 25 коп. серебром добровольного штрафа» [15, л. 5]. «Ученик должен уважать мастера, его жену и фамилию. Если ученик отлучится и потеряет дни рабочие, то его родители и родные обязуются платить 20 руб. серебром» [17]. Рамеснікі мястэчка Койданава ў 1849 г. таксама паведамлялі, што «…в портном, кушнерском, столярном, сапожном, красильницком, стекольницком и бумажном цехах нет порядка по неимению старшины и городского головы» [18].

У разглядаемы час не толькі шараговыя рамеснікі, але нават майстры і старшыні запісваліся ў цэхі неахвотна. Яны не жадалі падпарадкоўвацца цэхавым парадкам, якія абмяжоўвалі іх дзейнасць. Так, у 1845 г. мешчанін Радашковіч Фамін адмовіўся ад пасады старшыні кавальскага цэха, спасылаючыся на хваробу [12, л. 49]. Некаторыя цэхавыя старшыны і майстры не клапаціліся аб рамеснай вытворчасці цэха і яго чальцах. Яны глядзелі на цэх як на крыніцу дадатковых даходаў: частка з іх прысвойвалі цэхавыя грошы, а пры пераводзе чаляднікаў у майстры займаліся вымагальніцтвам. Напрыклад, у 1845 г. цэхавы галава шкляного цэха падаў рапарт на імя менскага цэхавага галавы Воўка, у якім гаворыцца, што «хотели записать подмастера стекольного ремесла еврея

Кренделя в мастера этого же цеха, но мастера этого цеха ни под каким предлогом его в число мастерей не приступили принять, делая от него вымогательство в деньгах и отложили до другого времени» [12, л. 2]. У рапарце цэхавага галавы ювелірнага цэха Аляхновіча ў менскую гарадскую думу ўказваецца, што былы ў 1841 г. цэхавы галава Пётр Ганіч разам з майстрамі «получал цеховые деньги»; Аляхновіч просіць думу. «чтобы она взыскала эти деньги и внесла в цеховую управу» [12, л. 6]. Майстры мінскага шавецкага цэха таксама скардзіліся, «что старшина Шевелевич ...сам забирает относящиеся к сапожному цеху доходы, удерживает из суммы для общей пользы» [19]. Аналагічнае становішча назіралася і па іншых цэхах.

Цэхавыя даходы былі нікчэмнымі. З «Книги прихода и расхода минского рымарского цеха» вядома, што з 1844 па 1845 г. яго прыход склаў толькі 12 руб. 45 кап. срэбрам, а з мая 1846 па чэрвень 1847 г. – 24 руб. 97 кап. [20]. Па шкляным цэху да 1857 г. увогуле не вялося ніякіх запісаў у кнігах. У 1857 г. тут прыход быў роўны 6 руб. 30 кап., а расход – 5 руб. 50 кап., а ў 1858 г. у касу гэтага цэха паступіла ўсяго толькі 1 руб. 40 кап. З гэтага ж года зноў ніякіх кніг не было заведзена [21, л. 28]. Кнігі прыходаў і расходаў па цырульніцкім, пальчаткавым, пераплётчыцкім і іншых цэхах таксама сведчаць аб вельмі малых даходах гэтых цэхаў і аб адсутнасці за многія гады запісаў у іх [21, л. 29–30]. Прыход і расход у розныя гады быў неаднолькавым, што відаць з дадзеных прыходу і расходу па мінскім шавецкім цэху (табліца 2) [21, л. 32].

*Табліца 2*

**Дадзеныя прыходу і расходу па мінскім шавецкім цэху**

| Гады | Прыход | | Расход | |
|---|---|---|---|---|
| | руб. | кап. | руб. | кап. |
| 1853 | 7 | 50 | 7 | 50 |
| 1854 | 44 | 90 | 24 | 50 |
| 1855 | 41 | 95 | 39 | 18 |
| 1856 | 39 | 96 | 35 | 46 |
| 1857 | 62 | 92 | 43 | 20 |
| 1858 | 41 | 47 | 16 | |
| **У сярэднім за 6 гадоў** | **39** | **78** | **27** | **64** |

Асноўны прыбытак рамесных цэхаў складалі: унёсак чаляднікаў, якія станавіліся майстрамі, а таксама з іх гандлёвых радоў і лавак. У асноўным чаляднікі ўносілі ў цэхавы даход па 3 рублі срэбрам [22]. Аднак былі і такія, што ўносілі па 2 руб. 50 кап. срэбрам, а некаторыя і менш. Трэба меркаваць, што сума ўзносу залежала не толькі ад май-

стра, але і ад матэрыяльнага стану таго ці іншага чаляднікa. У адным са шматлікіх дакументаў гаворыцца: «...Увидя его просьбу и признавая опытность в ремесле, признавая его бедность, он вносит в цеховой доход 2 рубля» [23]. Цэхавыя выдаткі ішлі на куплю сыравіны, ацяпленне і асвятленне, на канцылярскую паперу, рамонт і інш.

Заняпад цэхаў і іх ролю ў жыцці рамеснікаў адзначаў і гродзенскі губернатар. У 1829 г. ён пісаў: «Ремесленники цеховые, суть мещане, христиане и евреи, по родам их ремесел, хотя разделяются на цехи, но общества таковых никаких капиталов не имеют потому, что оным никакого дохода не уплачивают. Все они платят наравне с прочими в казну подать подушную, а также налоги на дороги, исполняют повинность земскую, рекрутскую, содержат военный постой и отбывают прочие городские обязанности; посему из своих работ они едва могут удовлетворить жизненные необходимости и пропитывать свои семейства» [24].

Такім чынам, у першай палове XIX ст. рамесныя цэхі Беларусі падвяргаліся значным трансфармацыям пад уздзеяннем таварна-грашовых адносін і станаўлення капіталістычных элементаў у гарадской эканоміцы. Дзяржаўнае рэгуляванне, у прыватнасці Статут мінскага рамеснага таварыства 1852 г., спрыяла скасаванню шэрагу абмежаванняў, звязаных з колькасцю вучняў і чаляднікаў, вытворчымі нормамі і манаполіяй цэхаў на рынак. Узмацнялася спецыялізацыя рамяства, стымуляваліся тэхнічныя інавацыі, а рамеснікі атрымалі большую эканамічную свабоду, у тым ліку магчымасць усталёўваць кошты на прадукцыю самастойна. У беларускіх гарадах і мястэчках рамесныя цэхі сутыкнуліся з канкурэнцыяй з боку мануфактур і фабрык, колькасць якіх штогод расла. Разам з гэтым назіраўся рост колькасці няцэхавых рамеснікаў і скарачэнне ўдзельнай вагі цэхавых майстроў, што сведчыць аб дэградацыі традыцыйнай цэхавай сістэмы і паступовым пераходзе да больш гнуткай эканамічнай мадэлі, якая была бліжэй да рынкавых механізмаў вытворчасці і збыту. Цэхі ў гэтых умовах з'яўляліся пэўным пераходным звяном паміж старой феадальнай і новай капіталістычнай мадэллю вытворчасці, яны не змаглі цалкам адаптавацца, але і не зніклі імгненна. Гэтая сітуацыя з гістарычнага пункту гледжання робіць існаванне цэхаў на беларускіх землях у першай палове XIX ст. унікальным.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Белоруссия в эпоху феодализма: сборник документов и материалов: в 3 т. / Академия наук БССР, Институт истории, Архивное управ-

ление МВД БССР; Т. 3. Воссоединение Белоруссии с Россией и ее экономическое развитие в конце XVIII – первой половине XIX века (1772–1860) / сост.: В. В. Чепко, В. В. Шатилло. – Минск: Изд-во Акад. наук БССР, 1961. – 624 с

2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 24. Оп. 1. Д. 605.

3. НГАБ. – Ф. 24. Оп. 1. Д. 627. Л. 7.

4. НГАБ. – Ф. 24. Оп. 1. Д. 928. Л. 39–48.

5. НГАБ. – Ф. 24. Оп. 1. Д. 1109. Л. 16–17.

6. НГАБ. – Ф. 1430. Оп. 1. Д. 1445. Л. 195–197.

7. НГАБ. – Ф. 1430. Оп. 1. Д. 20242. Л. 15.

8. Экономическое состояние городских поселений Европейской России в 1861–62 г. [Электронный ресурс]. – Санкт-Петербург: Тип. К. Вульфа, 1863. – 23 см.

9. Статистическое обозрение губернского города Могилёва // Журнал министерства внутренних дел (ЖМВД). – 1837. – Ч. 26. – № 12. – С. 409–426.

10. НГАБ. – Ф. 1. Оп. 1. Д. 191. Л. 21–22.

11. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 2. Оп. 15. Д. 722.

12. НГАБ. – Ф. 24. Оп. 1. Д. 117.

13. НГАБ. – Ф. 24. Оп. 1. Д. 83. Л. 1–13.

14. НГАБ. – Ф. 24. Оп. 1. Д. 763. Л. 1.

15. НГАБ. – Ф 10. Оп. 1. Д. 41.

16. НГАБ. – Ф. 24. Оп. 1. Д. 713.

17. НГАБ. – Ф. 10. Оп. 1. Д. 22. Л. 3.

18. НГАБ. – Ф. 24. Оп. 1. Д. 337. Л. 1.

19. НГАБ. – Ф. 295. Оп. 1. Д. 285. Л. 1–6.

20. НГАБ. – Ф. 24. Оп. 1. Д. 26. Л. 1.

21. НГАБ. – Ф. 24. Оп. 1. Д. 1044. Л. 28.

22. НГАБ. – Ф. 10. Оп. 1. Д. 27. Л. 1–8; Д. 25. Л. 4, 5, 15, 19, 20; Д. 34. Л. 3.

23. НГАБ. – Ф. 10. Оп. 1. Д. 25. Л. 2–3.

24. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Оп. 3. Д. 422. Л. 137.